ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

# ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● ● NO. 34 (3538) ● ● ЧАЦВЕР, 7 ВЕРАСНЯ, 2017

ШТОТЫДНЁВІК "ГОЛАС РАДЗІМЫ" МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: WWW.GOLAS.BY



**Сябе ў творчасці знайсці**

У Даўгаўпілсе ўшанавалі памяць народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна Стар. 2



**У ваколіцах Акінчыц**

На карце родных мясцін Якуба Коласа цяпер — і Царква святой Ганны ў Стоўбцах Стар. 3



**Злучаюць людзі гарады**

У Мінск прыязджае Магнітагорскі драмтэатр імя А. С. Пушкіна, у якім пачынаўся творчы шлях народный артысткі СССР Аляксандры Клімавай Стар. 4

СВЯТА

# Полацк мае слова

## Родны горад беларускага першадрукара Францыска Скарыны ўжо ў трэці раз быў сталіцай Дня беларускага пісьменства

**Іван Іванаў**

Сёлетняе свята было адметным, бо прысвячалася 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. І яшчэ гэтым разам старажытны Полацк адзначаў сваё 1155-годдзе. Вось якія глыбокія карані ў беларускай дзяржаўнасці (а горад на Дзвіне лічыцца яе калыскаю), вось якія даўнія культурныя традыцыі ўпітваў у сябе слынны ўраджэнец Полацка Францыск Скарына.

Раней, калі Дзень беларускага пісьменства толькі ўваходзіў у каляндар святочных датаў, такога размаху ў святкаванняў, відома ж, не было. Цяпер ёсць завядзёнка блаславляць святочныя дзеі ў храмах. У Полацку служылася Божая літургія ў Багаяўленскім саборы. Потым прадстаўнікі духавенства й творчай інтэлігенцыі краіны, якія з Дабрадатным агнём ад Гроба Гасподняга паўдзельнічалі ў Рэспубліканскай навукова-асветніцкай экспедыцыі "Шлях да святыняў", пасадзілі пры храме з маладых туй "Сад Малітвы". Тым і завяршылася чарговае паломніцтва ў Полацк, маршрут якога пралёг праз гарады й мястэчкі Віцебшчыны. Дарэчы, згадваецца: яшчэ ў 1995 годзе энтузіясты ладзілі пешае свецкае "Паломніцтва ў Полацк" — пра тое пісаў часопіс "Роднае слова". І сярод вершаваных радкоў там былі й такія, напісаныя з нагоды падзеі: "То пойдзем разам, сёстры і браты,/ Ў паломніцтва да полацкіх святыняў!". Як бачым, даўнія традыцыі паломніцтва, ці пілігрымак, цяпер адраджаюцца на нашай зямлі.

Рознымі шляхамі, з розных краёў дабіраліся ў слаўны Полацк на Свята Слова прадстаўнікі самых розных прафесій. Толькі літаратараў, паводле некаторых падлікаў, было каля 150. А цесна ў горадзе нікому ж не было, паколькі на розных пляцоўках праходзіла больш за 80 імпрэзаў. Скажам, падводзіліся вынікі Усебеларускай грамадска-палітычнай акцыі "Мы — разам!", праходзіла маладзёжнае свята "Мы — у тэме!" (а Полацк жа — і маладзёжная сталіца Беларусі-2017), а таксама фінал Усебеларускага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка", прысвечанага юбілею кнігадрукавання. Было і гашэнне маркі, паштовага канверта, прысвечаных Дню беларускага пісьменства ў Полацку. А вялікі Фэст кніг і прэсы шумеў, сустракаў шматлікіх гасцей побач з помнікам першадрукару. Там працаваў "Друкарскі двор XVI стагодзя" з рэканструяваным станком ды рознымі іншымі прыладамі. Сустрэчы літаратараў з чытачамі, літаратурна-музычныя праграмы і кампазіцыі... Напрыканцы дня ўшанавалі пераможцаў рэспубліканскага конкурсу на лепшыя творы ў розных жанрах літаратурнай творчасці. Сярод пераможцаў — і наша калега, празаік Людміла Рублеўская (за раман "Авантуры Пранціша Вырвіча, здрадніка і канфедэрата"), а таксама герой адной з нашых публікацый, вядомы публіцыст Зіновій Прыгодзіч (зборнік "Постаці"). Віншуем!

Цяпер эстафета Дня беларускага пісьменства перададзена ў горад Іванава, на Брэстчыну. Там у наступным годзе свята пройдзе ўпершыню, а для Беларусі яно будзе юбілейным, 25-м.



БЕЛТА

**Урачыстае адкрыццё Дня беларускага пісьменства ў Полацку**



УЛАДЗІМІР ШЛАПАК

**Такі друк — для моцных рук**

ВЕСТКІ

## Беларус-ардэнаносец з Цюмені

**Ганаровы Генеральны консул Беларусі ў Цюмені Уладзімір Шугля ўшанаваны расійскім Ордэнам дружбы**

Сябры-беларусы з Цюмені паведамілі ў рэдакцыю, што Уладзімір Шугля прымае віншаванні. Ва ўказе Прэзідэнта Расіі гаворыцца: Ордэнам дружбы ўзнагароджваецца Шугля Уладзімір Фёдаравіч — прэзідэнт таварыства з абмежаванай адказнасцю "Холдынгавая кампанія ГД "Мангазея", старшыня савета Цюменьскай абласной грамадскай арганізацыі "Саюз — інтэграцыя братэрскіх народаў". Адзначаны ж наш вядомы суплямяннік высокай узнагародай "за дасягнутыя працоўныя поспехі, актыўную грамадскую дзейнасць і шматгадовую добрасумленную працу".

Пра чалавека, які шмат робіць для развіцця беларуска-расійскага супрацоўніцтва, не раз пісала наша газета. Восенню 2013-га журналісты з Беларусі былі ў ягоным консульскім офісе, зрабілі вялікае інтэрв'ю з суплямterritory суплямеННікам для часопіса "Беларусь. Belarus". І летась у 5-м нумары часопіса, які прысвячаўся чарговаму Форуму рэгіёнаў Беларусі ды Расіі, выйшаў тэкст "Зямля і неба Уладзіміра Шуглі" — з падзагалоўкам: "У Ганаровага Генеральнага консула Беларусі ў Цюменьскай вобласці Расіі ёсць і глыбока асабістыя прычыны для таго, каб актыўна развіваць рознабаковыя кантакты паміж заходнесібірскім рэгіёнам і зямлёй яго продкаў".

Уладзімір Шугля сумяшчае сваю прадпрымальніцкую, консульскую, грамадскую дзейнасць з напісаннем вершаў, выдае кнігі, ён сябар Саюза пісьменнікаў Беларусі. За зборнік "Чацвёртае вымярэнне" у 2014-м ушанаваны ў Беларусі літаратурнай прэміяй "Залаты Купідон".

ПРЫЦЯГНЕННЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

# Тры вандроўныя дні

**Беларуская суполка ў літоўскай Клайпедзе "Крыніца" арганізавала для ахвотных экскурсійную паездку ў Беларусь**

Тры дні ў гасціннай краіне праляцелі непрыкметна. Удзельніца турпаездкі ў Беларусь Святлана Дзямідава дзялілася уражаннямі: "Краіна здзіўляе — і чысцінёй гарадоў, і ветлівымі людзьмі, якія лёгка і з задавальненнем ідуць на кантакт, і магазінамі з якаснай прадукцыяй, і выдатным станам гістарычных помнікаў... З найвялікшым задавальненнем прыеду сюды яшчэ не раз!"

Знаёмства з краінай пачалося з горада Ліды. Там сустрэла нас гід Алена Борыс, яна й суправаджала на працягу ўсёй вандроўкі. Мы даведаліся: гісторыя горада пачалася з будаўніцтва абарончага замка, ініцыятарам узвядзення якога яшчэ ў 1323 годзе стаў князь Вялікага Княства Літоўскага Гедымін. Сёння замак цалкам адноўлены звонку, а ў вежы хутка пераедуць багатыя калекцыі мясцовага краязнаўчага музея. Прадставілі нам анімацыйную праграму "Вяселле караля Ягайлы", частавалі прысмакамі, рэцэпты якіх дайшлі з той далёкай пары. Мы з задавальненнем пакаштавалі глінтвейн і гарбату, згатаваныя на вогнішчы.

Вядома, што ў Лідзе раней было развіта каля 200 рамёстваў. Сёння мясцовыя энтузіясты адрадзілі каля 40 з іх. Імкнуцца вытрымліваць аўтэнтыку, гэта значыць выкарыстоўваць тэхніку продкаў. А пры гарадскім Цэнтры рамёстваў аднаўлены і дзейнічае старадаўні лялечны тэатр "Батлейка".

Наведалі мы і знакаміты Лідскі піўзавод, заснаваны ў 1876 годзе. З цікавасцю даведаліся, што ваду для вытворчасці здабываюць прама на тэрыторыі завода з двух свідравін. Выкарыстоўваюцца на заводзе старадаўнія рэцэпты: піва і квас — гэта натуральным чынам зброджаныя напоі. Дарэчы, вытворцы пастаўляюць прадукцыю і ў Літву. Магчыма, у некаторых клайпедскіх экскурсантаў Ліда застанецца ў памяці менавіта як сталіца беларускага піваварства: там ужо болей за 300 гадоў робяць гэты напой з хмеля і соладу. І дасягнулі ў далікатнай справе высокага майстэрства.



**Госці з Клайпеды пабывалі ў Мірскім замку**

→ Стар. 4

КАРЫСНЫ ДОСВЕД

# Сябе ў творчасці знайсці

## У Даўгаўпілсе ўшанавалі памяць народнага паэта Беларусі Рыгора Барадуліна



Удзельнікі літаратурнай гасцёўні ў гонар паэта Рыгора Барадуліна

Ягоная паэзія — і глыбока-філасофская, і тонка-лірычная, і гарэзлівая, жартаўлівая... Вельмі розная. А думкі, вобразы, дзівосныя сугуччы ззяюць-пераліваюцца, нібы каштоўныя дыяменты. Зрэшты, кожны можа знайсці ў творчасці Рыгора Барадуліна тое, што яму да душы — з умовай: мову барадулінскую варта навучыцца разумець. І каб чуць яе — трэба ўмець услухацца, паглыбіцца ў плынь гаворкі жывой, народнай, сакавітай. Вось якраз тое й спрабавалі мы рабіць, калі ў даўгаўпілскім Цэнтры беларускай культуры (ЦБК) 26 ліпеня зладзілі літаратурную гасцёўню ў гонар народнага паэта Беларусі. Нагодай для таго была перасоўная выстава "Рыгор Барадулін. Прыходзім, каб знайсці сябе ў жыцці...". Яе прадставілі Міністэрства культуры Беларусі ды Дзяржаўны музей гісторыі беларускай літаратуры з Мінска.

Як вядома, 2017-ы аб'яўлены ў Беларусі Годам навукі. Таму ў ЦБК стартаваў праект "Навуковы музейны марафон" і была падпісана дамова аб доўгачасовым супрацоўніцтве паміж ЦБК і вышэйзгаданым музеем. У плыні пагаднення ладзіліся выставы, створаныя на аснове навуковых распрацовак літаратуразнаўцаў і даследчыкаў, прысвечаныя Янку Купалу, Максіму Багдановічу, Петрусю Броўку. І вось — магчымасць бліжэй пазнаёміцца з жыццём, творчасцю Рыгора Барадуліна (1935—2014). Ён вялікага таленту паэт, эсэіст, перакладчык: дзякуючы яму мы чытаем па-беларуску некаторыя творы Уільяма Шэкспіра, Амара Хайяма, Сяргея Ясеніна, Адама Міцкевіча, Джорджа Байрана ды іншых сусветна вядомых творцаў. Вясковец з Вушаччыны меў і фенаменальнае пачуццё гумару, напісаў шмат сатырычных і гумарыстычных твораў, эпіграм. Гэта быў і вядомы народны паэт Беларусі, імя якога цяпер шырока вядомае па ўсім літаратурным свеце.

Яшчэ Рыгора Іванавіча называюць віртуозам паэтычнага слова, і паэзія барадулінская — надзвычай самабытная і вобразная, поўніцца глыбокімі сэнсамі. Першыя вершы ягоныя пад псеўданімам А.Чабор з'явіліся ў друку, калі Рыгор вучыўся ў старэйшых класах. Галоўныя тэмы першага зборніка "Маладзік над стэпам" (1959) — нядаўняя вайна, духоўнасць і таленавітасць беларусаў, рэаліі пасляваеннага часу. Потым былі кнігі "Рунець, красавац, налівацца!" (1961), "Нагбом" (1963) ды іншыя. А за зборнік малітоўнай паэзіі "Ксты" (2005) паэт вылучаўся кандыдатам на Нобелеўскую прэмію. Ды непаўторную плынь ягонай думкі, вобразаў, сэнсаў, бадай, ніхто не зможа гэтак жа прыгожа, дасціпна перастварыць на іншай мове. Зрэшты, крыло славы ўсё ж Рыгора Іванавіча кранула: ён быў ушанаваны ордэнам Дружбы народаў, латвійскім ордэнам Трох зорак, медалём Францыска Скарыны, стаў лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы за зборнік вершаў "Рум" (1976).

Чаму, аднак, у Цэнтры беларускай культуры мы зладзілі менавіта літаратурную гасцёўню? Бо імкнемся падыходзіць да працы нефармальна, шукаць у дзейнасці новыя формы-фарматы. Вось і сабраліся ў нас людзі, неабыякавыя да мастацкага слова, да беларускай паэзіі.

"Трэба дома бываць часцей,/ Трэба дома бываць не госцем,/ Каб душою ты стаў чысцей/ І не страціў святое штосьці…" Вядомай песняй ансамбля "Песняры" на словы Рыгора Барадуліна распачыналі мы імпрэзу. "Менавіта гэты сімвалічны верш, які адкрыў нашу гасцёўню, кранае душу і сэрца кожнага беларуса — як у Беларусі, так і за мяжой", — казала кіраўніца ЦБК Жанна Раманоўская. Яна ж прадставіла і кнігу вершаў паэта "І свету ўсяму", якую нам на З'ездзе беларусаў свету падарыў рымска-каталіцкі прыход знакамітага мінскага Чырвонага касцёла. З яго, дарэчы, і праводзілі Паэта ў апошні шлях. Загалоўны верш прагучаў і на латышскай мове — яго чытала кіраўніца культурных праектаў ЦБК Настасся Лукашонак.

Велізарнае ўражанне на ўсіх зрабіў фільм пра Рыгора Барадуліна з сімвалічнай назвай "Пачуй!". На жывой, мілагучнай беларускай мове ў ім апавядаецца пра яркае жыццё і творчасць паэта. Потым, за кубкам гарбаты, мы чыталі вершы, дзяліліся думкамі, уражаннямі. Паэт Станіслаў Валодзька распавёў шмат цікавага пра дзядзьку Рыгора, з якім быў асабіста знаёмы. Займальна расказвалі пра шматтэмную і шматколерную барадулінскую паэзію адна сузаснавальніц даўгаўпілскага Беларускага таварыства "Уздым" Яўгенія Гуляева, паэтка і мастачка Настасся Сазанкова. Гаварылі таксама старшыня Асацыяцыі свабодных мастакоў Латгаліі Марыя Сафронава, член праўлення Саюза беларусаў Латвіі Валеры Амбросаў ды іншыя.

На пругкіх хвалях барадулінскай паэзіі вельмі душэўнай, лірычнай і цёплай атрымалася размова. І было ўражанне, што кожны з нас пачуў, зразумеў нешта важнае, пабываўшы ў сілавым полі вялікай паэзіі Рыгора Барадуліна. Спадзяюся, тыя адкрыцці дапамогуць нам у жыцці, бо, як пісаў паэт, "Прыходзім,/ Каб знайсці сябе ў жыцці,/ А не згубіцца/ І не разгубіцца..."

**Марыя Памецька,**
метадыстка Цэнтра беларускай культуры, г. Даўгаўпілс

ВЕСТКІ

# Людміла перамагае вершамі

**Іван Ждановіч**

**Беларуска з Таджыкістана стала адной з пераможцаў штогадовага Усерасійскага конкурсу "Героі Вялікай Перамогі"**

Спачатку Дзільбар Хамідава, маці паэткі Людмілы Запольскай, напісала ў рэдакцыю з горада Бустон (былы Чкалаўск, першынец атампрама СССР) Сагдзійскай вобласці, што яе дачка прайшла ў фіналісткі конкурсу. Пры тым добрым словам згадвала й публікацыю "Людміла, унучка салдата" (ГР, 5.05.2016) — пра складаны лёс ураджэнца Магілёўшчыны (Мсціслаўскі раён, сельсавет Падсолтава) Мікалая Андрэевіча Запольскага. Ён — удзельнік вайны, прайшоў праз палон і штрафбат, вятры таго суровага часу закінулі беларуса ў Таджыкістан. "І па гэты час драма яго жыцця прарастае балючымі, кранальнымі вершамі ў душы ягонай унучкі, артысткі з горада Чкалаўска" — пісалі мы. Той тэкст, па словах маці, падтрымаў паэтку, дапамог паверыць у творчыя сілы. А потым тэкст з "ГР" ды вершы Людмілы надрукаваў і часопіс "Нёман" — у спецвыпуску, прысвечаным Таджыкістану (№8, 2016).



А на пачатку жніўня мы даведаліся: Людміла Запольская стала адной з пераможцаў конкурсу ў намінацыі "Паэзія". На сайце конкурсу чытаем: "766. Запольская Людміла Аляксандраўна, "Короткая косичка". Гэта назва верша. Ён лірычны, кранальны ў сваёй простасці, у стылі вершаў знакамітага Эдуарда Асадава (які, аказваецца, быў родам з Туркменістана, з горада Мары). Гэты верш, я і іншыя творы Людмілы, ёсць у інтэрнэце. Піша яна па-руску, часта звяртаецца ў творчасці да тэмы Вялікай Айчыннай вайны.

Віншуем з перамогай, Людміла!

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

# Купала на жыццё натхніў

**Верш грузінскага паэта Татаоза Рухелі "Чалавек!", у якім згадваецца Янка Купала, пераклала на беларускую мову старшыня суполкі "Беларускія сябры" ў Тбілісі Вольга Градзінар**

Сусвет, кажуць, з радасцю выконвае нашыя шчырыя просьбы. У адным з рэпартажаў пра Янку Купалу, які выйшаў на беларуска-грузінскім інтэрнэт-партале http://mamuli.by/, мы звярнуліся з просьбай да чытачоў: "Магчыма, у каго ў архівах захаваліся фатаграфіі або дакументы, звязаныя з "грузінскімі матывамі" ў творчасці Песняра. Мы будзем вельмі ўдзячныя за любую інфармацыю!". Пасля таго геаграфія міжнароднага праекта "Янка Купала ў дыялогу культур" пашырылася выставай "Грузія, дружная з сонцам краіна!". Экспанавалася яна ў двух выдатных кутках Грузіі: курортным мястэчку Цхалтуба і ў горадзе Багдаці.

Ініцыятары і арганізатары праекта ў Грузіі шчыра палюбілі беларускага паэта. Нядзіўна, што Тамты Вардасанідзе, супрацоўніца Дэпартамента па курортах і турызме муніцыпалітэта горада Цхалтуба, звярнула ўвагу на размешчаны ў інтэрнэце верш грузінскага паэта Татаоза Рухелі, у якім згадваецца Янка Купала. Невялікае даследаванне й прывяло да рэальнага чалавека. Так мы пазнаёміліся з Гіяй Путкарадзэ.

Татаоз Рухелі (Гія Путкарадзэ) нарадзіўся ў 1960 годзе ў Заходняй Грузіі, у сяле Рухі недалёка ад Зугдзідзі (адтуль і псеўданім Рухелі). У 1977-м закончыў школу, а ў 1980-м паступіў у Данскі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт у Растове-на-Доне, дзе і жыве цяпер з сям'ёй. У 1976 годзе пачаў пісаць вершы, у якіх адлюстраваны яго любоў да роднай Грузіі, любоў да Бога і людзей.

Верш "Чалавек!", пра які тут ідзе гаворка, напісаны ў 1988-м: аўтару было 28. Каб зразумець, пра што верш, і ў якім ключы ў ім згадваецца беларускі Пясняр, я звярнулася да Мзіі Акобія, добрага сябра Купалаўскага музея ў Мінску, з просьбай зрабіць падрадковы пераклад. Атрымаўшы яго, з захапленнем прачытала своеасаблівы асабісты маніфест маладога паэта, у якім ён кажа пра выдатных людзей, творцаў, стваральнікаў — сярод іх і наш Янка Купала. Вось уражанні Мзіі: "Я была ўзрушаная.



Я. Колас і Я. Купала ў Грузіі

Прычым аўтар згадвае Янку Купалу ў кантэксце таго, што менавіта ён прыводзіць яго ў пачуццё, ажыўляе, адухаўляе. Ацэнка паэту нададзена тут найвышэйшая".

А мне вельмі захацелася, каб гэты верш загучаў па-беларуску. І ён загучаў — у выдатным перакладзе Вольгі Градзінар (пераклад глядзіце на сайце Капалаўскага музея). Там ёсць такі радок: "Купала зноў на жыццё натхніў"... Думаю, заканамерна, што верш, напісаны ў 1988 годзе, знайшоўся ў юбілейны год Янкі Купалы. І вядома, гэта — падарунак Песняру. Бо яшчэ ў 1905 годзе, на самым пачатку творчасці, у вершы "Чаго б я хацеў..."Янка Купала напісаў: "Дык жа знайсце, чаго б я хацеў,/ Аб чым думачкі толькі мае:/ Каб мой люд мою песню запеў/ І пазнаў, аб чым песня пяе!". Хочацца верыць, што верш "Чалавек!" Татаоза Рухелі надасць імпульс да ажыццяўлення мары Песняра. Таму што Сусвет рана ці позна адказвае на нашыя шчырыя просьбы.

**Эліна Свірыдовіч,**
супрацоўніца Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы

**ПАДАРОЖЖЫ**

# У ваколіцах Акінчыц

## На карце родных мясцін Якуба Коласа цяпер — і Царква святой Ганны ў Стоўбцах: ёсць меркаванне, што якраз там быў ахрышчаны Кастусь Міцкевіч, будучы народны паэт Беларусі

**Кацярына Мядзведская**

Пэўна, кожная мясціна Беларусі мае сваю легенду, паданне, цікавыя згадкі яе жыхароў. "Хаты — гэта гнёзды, а людзі як птушкі. Але цяпер яны ўсё болей адлятаюць. Далёка маладзейшыя, а сталыя побач, вунь на тым пагорку..." Ці яшчэ: "Добра, калі ў чалавека ёсць свая дарога, па якой ён ідзе ўпэўнена. Але ёсць і такія, што — як па лесе бегаюць, заблудзіўшыся". Гэткія ды іншыя назіранні-развагі да фотаздымкаў з гарадоў і вёсак краіны піша ў сваіх інтэрнэт-праектах "Бясконца чароўная...", "Нашы руіны" вандроўнік, архітэктар, рэстаўратар Уладзімір Цвірка.

Пра яго захапленне падарожжамі па Беларусі ды этнаграфічны музей на асабістым лецішчы і працу вітражыста мы пісалі ("Скарбы Уладзіміра Цвіркі", ГР, №18, 19.05.2016). Уладзімір Андрэевіч распрацоўвае адна- і двухдзённыя турмаршруты. Ёсць у яго тэматычныя вандроўкі: "Піраміды Беларусі", "Каменныя крыжы". З'явіліся і літаратурна-мастацкія: па мясцінах Янкі Купалы, Якуба Коласа, Напалеона Орды, Элізы Ажэшкі. Ідэя, безумоўна, не новая — пісьменнік Мікалай Чыркі, напрыклад, паводле сваіх паездак напісаў кнігу "Літаратурныя вандроўкі па зямлі Купалы і Коласа". І цудоўны фотаальбом "Беларусь. Зямля Песняроў" стварыў фотамастак Анатоль Кляшчук... Але ж і ракурсы, з якіх глядзіць на тыя мясціны падарожнік-архітэктар, цікавыя, ды яшчэ з каментарамі-запісамі.

Калі мы гутарылі з вандроўцам, ён расказаў і пра нядаўнюю паездку па родных мясцінах Якуба Коласа. "Першае, што здзівіла на Стаўпеччыне — атмасфера тых мясцін, — казаў. — Сядзібы "Акінчыцы", "Ласток", "Альбуць", "Смольня" — усе побач, за дзень можна іх аб'ехаць. А якая прырода! Казачна-фантастычная: кожная хатка — пасярод палёў і лясоў, нібы з верталёта скінутая. У вершах і прозе Коласа шмат апісанняў прыроды. Калі пабываў у яго родных мясцінах, зразумеў: якраз асяроддзе нарадзіла Коласа як вялікага творцу. Там — раздолле. Можна і салаўёў паслухаць, і душою адпачыць".

Перад тым, як выправіцца ў падарожжа, Уладзімір Андрэевіч вывучыў біяграфію Песняра, перачытаў яговыя паэмы "Новая зямля" і "Сымон-музыку", рамантрылогію "На ростанях". А "на мясцовасці" прыкмячаў, як суадносяцца апісанні ў творах з сучасным ландшафтам, заўважаў дэталі.

Пра Ласток у аўтабіяграфіі Якуб Колас пісаў: "Самыя раннія дзіцячыя гады мае прайшлі ў Сухошчыне, або Ластку. Гэта глухое месца — поле, навокал лес і адна толькі сядзіба лесніка: хата, гумно, хлеў". Чым жа ўнікальны Ласток, спрабаваў зразумець Уладзімір. Аўтэнтыкай! Там захавалася тая хата, у якой з 1885 па 1890 год жыла сям'я Міцкевічаў. "Уявіце: там бегаў маленькі Кастусь, будучы народны паэт Беларусі Якуб Колас, — усхваляваная казаў вандроўнік, — ён дакранаўся да печы, адчыняў дзверы, выходзіў на ганак. І гэта нешта незвычайнае! Дарэчы, мемарыяльная сядзіба-музей сёння жылая. Я разважаў над такім фенаменам. З аднаго боку, хата й нібыта "зношваецца", калі ў ёй нехта жыве, а з другога — у народзе кажуць, што няжылая хутчэй паміраё без людзей…"

Уладзімір Цвірка прыходзіць да высновы, што "жывая" сядзіба ў Ластку — цікавая "фішка", як кажа моладзь. Узаранае поле, дагледжаны агарод, цёплая печ у хаце, ручнік на плоце, куры-пеўні, карова… Гэта ж цікава наведнікам, інтэрактыў сёння ў модзе. Хай і ў Ластку госці акунаюцца ў "жывое асяроддзе" ды бачаць, як аруць поле плугам, жнуць жыта сярпом, косяць траву касой, а лён перацiраюць уручную. Пры жаданні ж могуць і самі паспрабаваць сябе ў той спрадвечнай сялянскай працы.

Пабываў падарожнік у Акінчыцах: там нарадзіўся паэт, а цяпер тое месца ўжо ўвайшло ў гарадскую рысу Стоўбцаў. "Пры шляху шырокім,/ Дзе стаіць камора,/ Я на свет радзіўся,/ Пад глухі шум бору", — пісаў Якуб Колас у вершы "На раздарожжы". У Акінчыцах бацька пісьменніка, Міхал Міцкевіч, служыў леснікам у лясах князя Радзівіла. Сёння "Акінчыцы" — мемарыяльная сядзіба, на хаце шыльда: "Тут 3 лістапада 1882 года нарадзіўся народны паэт Беларусі Якуб Колас (Канстанцін Міхайлавіч Міцкевіч)".

У захапленні Уладзімір Цвірка і ад Альбуці — там сям'я Міцкевічаў жыла з 1891 па 1902 год. Якуб Колас пісаў: "Альбуць запомнілася мне найболей яскрава. Там была надзвычай цікавая прырода. Леснікова пасада стаяла на бойкай дарозе, кудою ішлі і ехалі людзі. Нязмоўклыя цікавыя гутаркі новых людзей пашырылі мой запас ведаў аб людзях і наогул аб жыцці й далі мне багаты матэрыял для назірання". Альбуцкія мясціны паэт апісваў у многіх творах, а ў паэме "Новая зямля" Альбуць стала прататыпам Парэчча.

Знакавая мясціна ў жыцці Якуба Коласа і Смольня, што недалёка ад вёскі Мікалаўшчына (такая ў яе мясцовая назва). У 1910-м, праз восем гадоў пасля смерці Міхала, Міцкевічы нарэшце набылі сваю хату. У ёй жылі маці паэта, Ганна Юр'еўна, дзядзька Антось, сёстры Якуба Коласа Міхаліна, Алена, Марыя, браты Уладзя, Міхась (пазней жыў і памёр у ЗША, вядомы пад псеўданімам Антось Галіна) ды Іосіф. Дагэтуль растуць там ліпы, пасаджаныя Коласам. Яны памятаюць, як упершыню летам 1912-га сустракаліся там Якуб Колас і Янка Купала. У Смольні Якуб Колас працаваў над паэмамі "Новая зямля " і "Сымон-музыка", пісаў вершы, апавяданні. "Ва ўсіх гэтых сядзібах ёсць шмат агульнага: прырода, вясковы побыт, архітэктура, а таксама цудоўны Мастацка-мемарыяльны комплекс "Шлях Коласа" — драўляныя скульптуры паводле матываў твораў паэта, якія нібы злучылі ў адно цэлае ўсе Коласаўскія аб'екты-мясціны", — лічыць Уладзімір Цвірка.



**У родных мясцінах Якуба Коласа на Стаўпеччыне заўсёды рады гасцям**



**На Свяце паэзіі выступае Віктар Шніп**



УЛАДЗІМІР ЦВІРКА

**Альбуцкія краявіды натхнялі Песняра. Масток цераз рэчку**

Драўляныя скульптуры стаяць паўз дарогі Стоўбцы — Мікалаўшчына з адгалінаваннем у Альбуць. "Дарога дзядзькі Якуба", "Сцяжына навазямельцаў", кампазіцыя "Песняй вітаю я вас!" — вось некаторыя з іх, створаныя майстрамі-разьбярамі на пачатку 90-х. На жаль, многія з драўляных фігур з часам растрэскаліся-пакасіліся. Уладзімір Цвірка прапаноўвае свой варыянт выратавання арыгінальнай задумы: праводзіць там пленэры для студэнтаў-архітэктараў, дызайнераў, скульптараў, разьбяроў. А сярод моладзі шмат талентаў, упэўнены Уладзімір Андрэевіч, то хай панову, але творча падыдуць да справы. І "Шлях Коласа" можа папоўніцца новымі экспанатамі, ажывіцца. "Трэба толькі распрацаваць адзіную канцэпцыю, у плыні якой і рухацца", — упэўнены дызайнер.

Асабліва зацікавіўся Уладзімір Цвірка былым хутарам Цёмныя Ляды, дзе амаль два гады пасля астрога (пакаранне за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе) жыў Кастусь Міцкевіч. Там стварыў школку, дзе навучаліся дванаццаць сялянскіх дзяцей, пісаў вершы. Дарэчы, першы апублікаваны ў газеце "Наша доля" верш "Наш родны край" напісаў ён менавіта ў Цёмных Лядах. І псеўданім Якуб Колас нарадзіўся там. Сёння ж няма на тым месцы ні вёскі, ні хутара, ні смалярні, а ні сядзібы... Адзін толькі камень з памятнай шыльдай, дый то — на другім баку чыгункі... "Добра было б узнавіць сядзібу, — марыць Уладзімір Андрэевіч. — І план яе, і фотаздымкі захаваліся..."

У свой турмаршрут уключыў вандроўнік і вёску Мікалаўшчыну. Ёсць там школа, падобная на невялікі палац: будавалі па эскізах самога Песняра. Школа беларускамоўная, носіць імя Якуба Коласа. Штогод праводзяцца ў ёй разнастайныя літаратурныя конкурсы, алімпіяды, створаны музей.

Вандруючы па Стаўпеччыне, задаўся Уладзімір Цвірка пытаннямі: якога ж веравызнання быў Якуб Колас ды ў якім храме яго хрысцілі? З імі й звярнуўся да спадарыні Зінаіды Камароўскай, дырэктаркі Літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа. Тая прызналася: раней у іх ніхто пра тое не пытаў... Узняўшы дакументы, параіўшыся з роднымі паэта, музейшчыкі прыйшлі да высновы: магчыма, хрысцілі будучага Песняра ў Ганнінскай царкве ў Стоўбцах. Па іншай версіі — у Свята-Успенскім храме ў вёсцы Новы Свержань. Дакладна ж вядома, што Якуб Колас быў праваслаўным, а хросны бацька яго — дзядзька Антось. Цяпер супрацоўнікі музея пісьменніка на сувязі з прыходамі: высвятляюць, ці захаваліся якія дакументы, метрыкі... А Уладзімір Цвірка рады, што паспрыяў адкрыццю яшчэ адной з малавядомых старонак у біяграфіі Песняра.



ТЭАТРАЛЬНЫ СЕЗОН

# Злучаюць людзі гарады

## У Мінск на гастролі прыязджае з Расіі Магнітагорскі драмтэатр імя А. С. Пушкіна, у якім пачынаўся творчы шлях вядомай у Беларусі актрысы, народный артысткі СССР Аляксандры Клімавай



**Аляксандра Клімава ў ролі Камісара ў спектаклі "Аптымістычная трагедыя". 1957 г.**

**Іван Ждановіч**

Магнітагорск, нагадаем, другі па велічыні горад Чалябінскай вобласці, адзін з найбуйнейшых сусветных цэнтраў чорнай металургіі, буйны культурны, дзелавы цэнтр Паўднёвага Урала. І тэатр у горадзе моцны: паводле версіі часопіса "Forbes" ён — сярод дзесяці найцікавых тэатраў Расіі. Пра тое нам напісала Ларыса Каліноўская з Нацыянальнага акадэмічнага драмтэатра імя Максіма Горькага — менавіта на яго сцэне пройдуць 8-10 верасня гастролі. Расіяне, дадае калега, вязуць тры спектаклі: камедыю Лопэ дэ Вега "Вынаходлівая закаханая", меладраму "Цёмныя алеі" паводле твораў Івана Буніна і драму Яўгена Грышкаўца "Зіма".

Гледача можа завабіць і тое, што да магнітагорскай сцэны інтарэс маюць артысткі сусветна вядомыя. Тры сезоны працавала там француженка Ан Сельер, і менавіта ў Магнітагорску ўпершыню ў Расіі паказала свой монаспектакль "Мадам Маргарыт" зорка французкага тэатра і кіно Ані Жырардо. А ў 2008-м спектакль магнітагорцаў "Навальніца" па п'есе Аляксандра Астроўскага ў пастаноўцы Льва Эрэнбурга адзначаны самай прэстыжнай у Расіі тэатральнай узнагародай "Залатая Маска".

Што, аднак, яднае Беларусь з гэтым тэатрам? "Сувязь ёсць, ды яшчэ якая моцная: у ім пачынала творчы шлях народная артыстка СССР, адна з найвядомых актарак нашага НАДТ імя Горкага Аляксандра Клімава, — піша Ларыса Каліноўская. — У Магнітагорску закончыла школу, а ў 1942-45 гадах будучая зорка сцэны была актаркай мясцовага тэатра, выступала ў ваенных шпіталях. На магнітагорскай сцэне сыграла Аню ў спектаклі "Вішнёвы сад" па п'есе Антона Чэхава і Кацьку ў "Варварах" Максіма Горкага". У 1945-м Клімава паступіла ў Маскоўскае вышэйшае тэатральнае вучылішча імя Шчэпкіна, пасля заканчэння яго працавала ў Адэсе, Кіеве, Харкаве. З 1956 па 2004 год яе талент раскрываўся ў Мінску, на сцэне нашага Рускага тэатра, як яго яшчэ называюць. Клімава сыграла больш за 80 галоўных роляў у тэатры і кіно, выкладала ў тэатральнамастацкім інстытуце, была ўшанавана шматлікімі ардэнамі, медалямі савецкага і беларускага ўрадаў. У 1969-м ёй прысвоена званне народнай артысткі СССР". Цяпер у Рускім тэатры працуе сын акторкі, Андрэй Душачкін — акцёр тэатра і кіно, педагог, літаратар, заслужаны артыст Беларусі. Ён, дарэчы, іграе аднаго з марскіх афіцэраў у прэм'ерным спектаклі па п'есе Андрэя Курэйчыка "Падводнікі". Лічыць: спектакль атрымаўся сур'ёзным, ёсць у ім што іграць і пра што гаварыць з гледачом. Да таго ж у пастановачнай версіі рэжысёра Сяргея Кавальчыка спектакль нясе моцны зарад годнасці, высокай маральнасці — таму Андрэй Душачкін іграе ў ім з вялікім задавальненнем. Прэм'ерай 15 жніўня і адкрываўся новы сезон.

А што для Андрэя Магнітагорск, ці бываў ён там? "Гэта горад, дзе жылі бацькі мамы, дзе яна жыла й працавала ў вайну на ваенным металургічным заводзе: там рабілі дэталі для танкаў, — гаворыць Андрэй Андрэевіч. — А ўвогуле нарадзілася мама ў 1921-м у Казахстане, у Кастанайскім раёне: там ёсць пасёлак Затабольск, які раней называлі вёскай Самадураўкай. Мама вучылася ў Магнітагорску ў школе, наведвала там драмгурток, і потым два гады адпрацавала ў мясцовым тэатры. А калі закончылася вайна — паехала вучыцца ў Маскву. Вядома ж, бацькоў наведвала. І калі я быў малым, то мяне вазілі туды: да бабулі-дзядулі, пакуль былі жывыя. Бабуля Аляксандра Слажанікіна, памятаю, карміла мяне пяльменямі, бліны ўсе вельмі любілі. Песні мне спявала, казкі баяла — сама ні чытаць, ні пісаць не ўмела. Увогуле гэта была сялянская сібірская сям'я, што ў пару калектывізацыі ў Казахстан уцякла — ад раскулачвання. Калі ж было "пацяпленне", то перабраліся ў Магнітагорск. Дарэчы, усе хлопцы, маміны браты, на вайне пагінулі — яна ў сям'і засталася ды меншая сястра. У Клімавых быў у Магнітагорску свой "вясковы" дом, хата. Увогуле Магнітагорск быў напалову драўляным. І, калі шчыра, я не надта любіў туды ездзіць: бо горад суровы, прамыслова-шахцёрскі, а я ж там заставаўся без мамы..."

Ці ўшанавана неяк памяць Аляксандры Клімавай у Магнітагорску — Андрэй не ведае. А ў Мінску на доме па вул. Янкі Купалы, 7, дзе яна жыла і памерла (2005), мемарыяльная дошка ў яе гонар устаноўлена ў 2007 годзе. У кватэры Клімавай і жыве сын з сям'ёй, прысвяціў маці сваю кнігу "Па той бок люстэрка". У Маскве, у ганаровай галерэі ў "Шчэпцы", ёсць яе партрэт. На Маскоўскіх могілках, дзе пахавана Аляксандра Клімава, стаіць ёй прыгожы помнік. Побач, дарэчы, і магіла Расціслава Янкоўскага, вядомага акцёра (памёр 26 чэрвеня 2016 года), з якім яны разам усё жыццё ігралі на сцэне Рускага тэатра.

Сам Андрэй Душачкін — "дзіця трох народаў". Нарадзіўся ў 1960-м у Мінску, тут жыве і працуе. Бацька ў яго быў карэнны кіяўлянін, працаваў да жаніцьбы акцёрам у Тэатры Лесі Украінкі. Па гэты час Андрэй вельмі любіць Кіеў, бо "рос я там, рос на Дняпры", у яго там вялікая радня. Сярод тых Душачкіных ёсць маракі Дняпроўскай флатыліі, урачы, інжынеры-тэхнары, а вось артыстаў, акрамя Андрэя, у родзе больш няма.

ПРЫЦЯГНЕННЕ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ

# Тры вандроўныя дні

**(Заканчэнне.
Пачатак на стар. 1)**

Моцна пацярпела Ліда пад час Вялікай Айчыннай вайны. І памяць пра мінулае там захоўваюць і берагуць. Ад гісторыі ў Беларусі не адмаўляюцца: яе не перарабляюць на ўгоду новых павеваў, назвы вуліц і будынкаў не зменьваюць, помнікі не зносяць…

На другі дзень мы наведалі шклозавод "Нёман" у Бярозаўцы, заснаваны ў 1883 годзе. Для мястэчка, у якім звыш 2000 жыхароў, гэта жыццёва неабходнае прадпрыемства. Яно апошнім часам пашырае асартымент: там падступаюцца да багемскага шкла, наладжаны выпуск будаўнічай шклаваты. Мы пазнаёміліся з тэхналогіяй вырабу каляровага шкла і хрусталю. Паназіралі, як майстры апрацоўваюць вырабы. Пабывалі ў завадскім музеі — гэта сапраўдная чароўная хрустальная казка. Кожны з нас атрымаў у падарунак хрустальная цукерніцу.

Далей шлях ляжаў у мястэчка Мір. Каталіцкі касцёл, праваслаўная царква, іудзейская сінагога фарміруюць ансамбль яго Рынкавай плошчы. А над мястэчкам узвышаецца велічны Мірскі замак. Ён сустракае гасцей магутнымі каменнымі сценамі ды вежамі. Занесены ў Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА, і ўсе зборы ад наведвання яго турыстамі ідуць на аднаўленне іншых замкаў Беларусі.

Канешне, завіталі мы ў Мінск. Дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ўразіў не толькі маштабамі, але й сучасным спосабам падачы матэрыялу. Экспазіцыя ёміста распавядае пра 1100 трагічных дзён і начэй акупацыі фашыстамі Беларусі ды гераічную барацьбу народа за вызваленне.

Візітнай карткай горада стаў сучасны будынак Нацыянальнай бібліятэкі. Гэта не толькі багаты збор кніг, але і велізарны мультыфункцыянальны цэнтр. У бібліятэцы выкарыстоўваюцца найноўшыя тэхналогіі. Нават лямпы ў чытальных залах такія, што іх святло не разбурае старонкі кніг. З агляднай пляцоўкі, на 23 паверсе будынка, мы любаваліся цудоўным панарамным выглядам сталіцы. Каля ўваходу ў бібліятэку стаіць помнік першадрукару Францыску Скарыну, друкарня якога была і ў Вільні.

Пад час паездкі ў Беларусь мы зразумелі, што багатая краіна дабрынёй і гасціннасцю жыхароў. Вось што кажуць удзельнікі паездкі:

**Наталля і Аляксей Рэпіны**: "Выдатныя людзі жывуць у Беларусі. Берагуць родную зямлю. Праграма была выдатная. Чакаем новых запрашэнняў".

**Алег Зіноўеў**, школьнік: "Мне вельмі спадабалася Беларусь сваімі малымі гарадамі. А самая цікавая экскурсія была ў Мінску. Гэта сапраўдны сучасны горад. Шмат гандлёвых цэнтраў, рэстаранаў і высокіх будынкаў — усё, што трэба вялікаму гораду. Уражваюць і музеі. Паездка назаўсёды застанецца ў мяне ў памяці".

**Сяргей Салянскі**: "Памятаю Беларусь з дзяцінства і бачу, што краіна мяняецца ў лепшы бок. Менавіта ў такіх вандроўках пазнаецца родны край. Уразілі душэўнасць і цеплыня жыхароў. Дзякуй арганізатарам і гідам!"

**Ірына Бяляева,**
г. Клайпеда



**Беларусь уразіла падарожнікаў сваімі храмамі**

**Заснавальнік:** Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Рэдакцыя газеты «Советская Белоруссия». Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэдактар** Віктар Міхайлавіч Харкоў
**Адрас рэдакцыі:** Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, Мінск
**Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61.** Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь
**Бюро па рэкламе:** Тэл. +375 17 287 16 91
**Тэлефон рэдакцыі:** +375 17 287 15 32; факс: +375 17 287 15 26
**E—mail:** golas_radzimy@tut.by
**Аб'ём выдання:** 1 друк. арк. **Тыраж:** 1935, **Заказ:** 1216
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/106 ад 30.04.2004. Праспект Незалежнасці, 79, 220013, Мінск
**Час падпісання ў друк:** 20.10
Выходзіць 1 раз на тыдзень
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
**© "Голас Радзімы", 2017**